Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# ЧАРАНКАВАННЕ ІГЛІЧНЫХ РАСЛІН

**Іглічныя расліны можна лёгка размножыць чаранкамі ў хатніх умовах. І зіма — лепш час для гэтага занятку. Можна ўкараніць ядловец, кіпарысавік, тую і некаторыя гатункі елкі. А вось сосны дрэнна размнажаюцца ўкараненнем, гэтыя хвойнікі звычайна прышчапляюць.**

**НАРАЗАЕМ**

Каб размножыць хвойнікі вегетатыўным спосабам, у лютым з галінак 2-га і 3-га парадкаў трэба зразаць чаранкі даўжынёй 7—15 см разам з «пяткай» — сплей драўнінай. Калі кавалачак кары атрымаўся вельмі доўгім, яго лепш трохі падрэзаць, каб чаранок не падгніў.

Зрэзаныя галінкі не варта захоўваць. Трэба як мага хутчэй заняцца іх укараненнем. Калі вы не паспелі загадзя падрыхтаваць глебу, а чаранкі ўжо зрэзалі, абгарніце іх вільготнай тканінай і пакладзіце ў цёмнае і прахалоднае месца.

**УКАРАНЯЕМ**

У лютым у іглічных раслін пачынаецца актыўны рух соку, імклівa развіваецца каранёвая сістэма, таму чаранкі паспяхова ўкараняюцца (амаль у 100% выпадкаў) і потым добра прыжываюцца на пастаянным месцы.

1. Секатарам зрэжце іглізу з ніжняй часткі чаранка. Затым апусціце галінкі ў раствор эпіну на 12 гадзін. На 0,5 шклянкі вады досыць 2 кропель стымулятара росту.

2. Пакуль чаранкі замочваюцца, падрыхтуйце сфагнум: пакладзіце яго ў пластыкавую міску або кантэйнер і наліце туды вады. Затым раскладзіце злёгку адціснуты сфагнум на марлі або пялёнцы.

3. Насыпце ў плоскі посуд «Карнявін», апусціце проста ў парашок зрэз чаранка, які затым пакладзіце на сфагнум і прыкрыйце пялёнкай або марляй.

4. Згарніце тканіну ў рулон, перавяжыце яе гумкай, змясціце ў тонкі поліэтыленавы пакет і падвесьце на аконную раму.



Да сярэдзіны вясны чаранкі павінны ўкараніцца. Тады іх можна высадзіць на дагадоўванне ў адкрыты грунт, а праз 1—2 гады — на пастаяннае месца ў садзе.

Таксама чаранкі іглічных раслін можна ўкараніць у гаршках дыяметрам каля 15 см, запоўненых сумессю торфу, садовай зямлі, пяску і хвойнай кары ў роўных частках. У кожны высаджвайце па 5—7 чаранкоў, заглыбляючы іх на 2,5—3 см.

На гаршчок надзеньце поліэтыленавы пакет або каўпак з пластыкавай бутэлькі і пастаўце ў светлае месца з тэмпературай паветра 17—19 °С. Перыядычна апырсквайце глебу з пульверызатара. Яна ўвесь час павінна быць злёгку ўвільготненай.

Праз 1—2 месяцы чаранкі ўкарэняцца, і з надыходам стабільна цёплага надвор'я іх можна будзе перасадзіць у адкрыты грунт.

# СВЯЦІЛЬНІКІ ДЛЯ РАСАДЫ

Калі мала святла, то расада дрэнна развіваецца і выцягваецца. У такім выпадку патрабуецца дадатковае асвятленне. Неабавязкова для гэтага купляць адмысловыя свяцільнікі. Нешта падобнае можна зрабіць самім.

Вазьміце скрынкі ад цукерак і абляпіце іх знутры фольгай. Гэтыя свайго роду люстэркі размясціце справа, злева і перад расадай. Яны павінны стаяць такім чынам, каб знаходзіцца вышэй за кантэйнеры з раслінамі. У гэтым выпадку святло ад акна адлюстроўваецца ад фольгі і асвятляе раўнамерна расаду.

Атрымліваецца, што такія «люстэркі» працуюць як свяцільнікі і дадаткова асвятленне для расады. У выніку сцёблы не хіляцца да акна, а растуць прама.

Як бачыце, усё вельмі проста і грашовая эканомія ў наяўнасці.



# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.07 | 17.37 | 8.30 |
| Віцебск — | 9.02 | 17.21 | 8.19 |
| Магілёў — | 8.57 | 17.27 | 8.30 |
| Гомель — | 8.48 | 17.30 | 8.42 |
| Гродна — | 9.22 | 17.53 | 8.31 |
| Брэст — | 9.16 | 18.00 | 8.44 |

## Месяц

*Маладзік 28 студзеня. Месяц у сузор'і Казярога.*

## Імяніны

*Пр. Тацяны, Пятра, Савы. К. Ірэны, Тацяны, Эльвіры, Генрыха, Мілаша, Паўла, Яна.*



Фота Яўгена ШАСТАКОВА.

# ЗАЎТРА




# Даты Падзеі Людзі

## 25 СТУДЗЕНЯ

**1832** год — нарадзіўся Іван Іванавіч Шышкін, рускі жывапісец, адзін з найбуйнейшых майстроў рэалістычнага пейзажнага жывапісу. Напісаў карціны «Раніца ў сасновым лесе», «Жыта» і многія іншыя. У 1883 і 1892 гадах прыязджаў у Беларусь, напісаў шэраг пейзажаў Палесся. Стварыў 20 эцюдаў у Белавежскай пушчы. Сярод іх «Ссечаны дуб», «Сухастой», «У Белавежскай пушчы», «Буралом» і іншыя. У 1893 годзе Шышкін арганізаваў выставу сваіх палескіх работ у Пецярбургскай акадэміі мастацтваў.

**1869** год — нарадзіўся (фальварак Кавалькі, цяпер у Мядзельскім раёне) Адам Гілярый Калістахавіч Гурыновіч, беларускі паэт, фалькларыст, перакладчык. У 1887 годзе скончыў Віленскае рэальнае вучылішча, дзе цікавіўся беларускім фальклорам, пытаннямі граматыкі жыцця. У 1887—1893 гадах вучыўся ў Пецярбургскім тэхналагічным інстытуце. Быў членам, пазней кіраўніком нелегальнага «Гуртка моладзі польска-літоўскай, беларускай і малярускай». Пісаў на беларускай, польскай і рускай мовах. У паэтычных творах быў паслядоўнікам Ф. Багушэвіча. Звяртаўся да жанраў балады, байкі, пейзажнай лірыкі. Пераклаў на беларускую мову паасобныя творы А. Пушкіна, І. Крылова, М. Някрасава, А. Міцкевіча, Э. Ажэшкі, І. Франко і іншых. Памёр у 1894 годзе.

**1882** год — нарадзілася Вірджынія Вулф, англійская пісьменніца і літаратурны крытык, тэарэтык і практык мадэрнізму. Аўтар раманаў «Місіс Дэлаўэй», «Да маяка», «Хвалі».

**1902** год — нарадзіўся (хутар Альховікі, цяпер у Шумілінскім раёне) Пётр Захаравіч Калінін, партыйны і дзяржаўны дзеяч Беларусі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. Быў на партыйнай і савецкай рабоце. У Вялікую Айчынную вайну — 2-гі сакратар ЦК КП(б)Б, адначасова — член Ваеннага савета 21-й арміі, намеснік начальніка штаба партызанскага руху пры Ваенным савеце Заходняга фронту, з верасня 1942 года — начальнік Беларускага штаба партызанскага руху. З 1944-га — першы сакратар Гродзенскага абкама КП(б)Б, з 1948-га — намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР. Памёр у 1966 годзе.

**1924** год — адкрыліся І зімовыя Алімпійскія гульні ў Шамані. На спаборніцтвы з'ехаліся 258 спартсменаў (у тым ліку 13 жанчын) з 16 краін. Германію да ўдзелу не дапусцілі, тады як яе былыя саюзніцы, Аўстрыя і Венгрыя, запрашэнні атрымалі. Праграма мерапрыемства ў Шамані ўключала лыжны спорт, хуткасны бег і фігурнае катанне, а таксама хакей. У неафіцыйным камандным заліку ўсіх абышла Нарвегія. Пасля заканчэння першых зімовых Гульняў прадстаўнікі краін-удзельніц прызналі правядзенне зімовых Алімпіяд мэтазгодным і перспектыўным, а ў 1925 годзе МАК прыняў канчатковае рашэнне аб рэгулярным правядзенні зімовых Алімпійскіх гульняў.




## Было сказана

**Анатоль ВЯРЦІНСКІ, паэт:**

*«І ведай: з сумленнем змагацца -*
*Гэта няўдзячная праца,*
*Гэта — разбой, а не бой...»*

# УСМІХНЕМСЯ

Дапамагу пахудзець! Бяру на сябе вашы абеды і вячэры.

Студэнт Пятроў.

**— Я ж прасіла адну бутэльку купіць!**

**— Адной не было!..**

Супрацоўнік ДАІ, які заблукаў у падмаскоўным лесе, скарыстаўшыся дапамогай свядомых і добразычлівых грамадзян, ужо праз нейкі год з невялікім выйшаў з гушчару пад Саратавам.

**Дзве сяброўкі дзеляцца ўражаннямі ад праведзенага вечара.**

**— Ты, кажаш, у тэатр хадзіла з палюбоўнікам? Ну, і што там было?**

**— Трагікамедыя.**

**— Цікава, раскажы.**

**— Мы сутыкнуліся з маім мужам. Ён быў таксама з палюбоўніцай.**

Урокі зроблены. Маці ахрыпла, сын аглух.

Суседзі вывучылі ўсё на памяць, сабака пераказала!




Малюнак Вікенція ПУЗАНКЕВІЧА і Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 301.

Нумар падпісаны ў 19.30 24 студзеня 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12